№ 79 (3820)

8 кастрычніка 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ГУЧНАЯ СПРАВА

Ксёндз Лазар: «Чакаю вызвалення, бо ні ў чым не вінаваты»

Сваякі ксяндза Уладзіслава Лазара атрымалі ад яго першы ліст, хаця арыштаваны барысаўскі пробашч быў ажно чатыры месяцы таму.



Ксёндз Уладзіслаў, абвінавачаны ў дапамаганні шпіянажу, не прызнае сябе вінаватым. Гэта вынікае з ліста, які атрымала сястра вязня Яніна.

Паводле інфармацыі сайта Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі, на пачатку кастрычніка Папа Рымскі Францішак заявіў, што хоча ведаць усе падрабязнасці справы арыштаванага ксяндза і далей будзе сачыць за тым, як яна будзе вырашацца. Пры гэтым пантыфік выказаў вялікую занепакоенасць сітуацыяй вакол арыштаванага КДБ ксяндза.

Уладзіслава Лазара па-ранейшаму ўтрымліваюць у СІЗА КДБ, ліставанне з ім па невядомых прычынах абмежаванае. Ягоныя прыхаджане напісалі ў "амерыканку" словы падтрымкі, але адказу на свой ліст не атрымалі. Вернік з Барысава Барыс Чупрынскі распавёў Радыё Свабода: *"Мяркую, яму там даводзяць, які ён несумленны. Але мы вырашылі яго падтрымаць і напісалі яму, што ведаем, які ён насамрэч добры і сумленны чалавек. Каб ён ведаў, што мы ў гэта верым".*

ЛІЧБА ДНЯ

1,1 мільёна беларусаў працуюць за мяжой

Такую лічбу прыводзіць у сваім даследаванні Сусветны банк.

Белстат некалькі дзён таму даваў статыстыку, што ў эканоміцы Беларусі ў студзені—жніўні 2013 года былі занятыя 4 мільёны 529,7 тысячы чалавек.

ДИСКУССИЯ



Валерий КОСТКА, фермер, подполковник КГБ в отставке

Референдум в условиях диктатуры — это дубина в руках диктатора против народа

Чтобы мои однокурсники по юрфаку не обвинили меня в плагиате, сразу отмечу, что умозаключение, вынесенное в заглавие статьи, принадлежит не мне. Так нас учил доктор юридических наук, профессор, читая курс лекций по курсу "Общая теория права" на юрфаке БГУ. И слушали мы эти лекции, когда не было еще Конституции Республики Беларусь 1994 года, не было должности Президента Республики Беларусь и никто не мог даже предположить, кто станет ППРБ.

Объективные законы действуют во времени и пространстве, не зависят от нашего сознания, наших желаний, и, зная их, можно искать объяснения происходящим процессам и прогнозировать развитие событий.

Ничего личного. Голая теория. Для начала.

Главным носителем, первоисточником власти является НАРОД, это объективно, это общепринято международным сообществом, как бы кому ни хотелось. Народ наделяет властными полномочиями тех, кого избирает, и позволяет им от своего имени управлять общественно-политическими и социально-экономическими отношениями в обществе.

При демократической форме правления народ добровольно делегирует свои полномочия тому, кто в открытой, в равных условиях, борьбе по своим профессиональным, моральным, интеллектуальным качествам более подготовлен осуществлять управленческие функции и представлять интересы народа. Процедура избрания — открытая, честная, прозрачная. Контроль общества за процессом избрания ничем не ограничивается на всех стадиях выборов. Результаты голосования и оглашенные итоги соответствуют друг другу. Так же, как суть и форма соответствуют понятию добровольных выборов.

При диктаторской форме правления власть народа захватывается, узурпируется преступным путем. Либо путем мошенничества (обман, подкуп, фальсификация), либо силовым способом (устрашение, принуждение, использование административного ресурса). Чаще всего используется весь комплекс противоправных методов. Преступных, потому что они противоречат национальным законам и конституциям. Но ни международная общественность, ни свой народ не признают власть, полученную преступным путем. Поэтому все усилия диктатур и направлены на форму, на внешнее оформление политической кампании, чтобы придать ей вид демократических выборов. Это означает, что необходим сценарий правдоподобия демократического процесса, нужны "актеры, клоуны, массовики-затейники", нужно информационное обеспечение и т.д.

(Окончание на 2-й стр.)

КОРАТКА

Баўмгертнер сядзіць без інтэрнэту

Адвакаты азнаёміліся з дапоўненымі матэрыяламі справы генеральнага дырэктара "Уралкалия" Уладзіслава Баўмгертнера. Аднак каментаваць сутнасць абвінавачанняў яны па-ранейшаму адмаўляюцца.

"У ягоным становішчы нічога не змянілася, — паведаміў Радыё Свабода Дзмітрый Гарачка. — Са здароўем у яго ўсё ў парадку, прагулкі не дазволены. Інтэрнэту ў яго, канешне, няма, інакш вы б яму наўпрост тэлефанавалі".

4 кастрычніка Следчы камітэт Беларусі паведаміў, што абвінавачанне Уладзіславу Баўмгертнеру было дапоўнена. З крымінальнай справы вылучаны і перададзены ў Генеральную пракуратуру Беларусі 19 тамоў матэрыялаў па факце прычынення шкоды інтарэсам Расіі.

Ладуцька незадаволены

Старшыні Мінгарвыканкама Мікалаю Ладуцьку не падабаецца якасць гандлёвага абслугоўвання.

"Зваротаў грамадзян менш не становіцца, — цытуе belta.by чыноўніка. — Недахоп кадраў не можа быць прычынай нізкай культуры абслугоўвання, якой павінна надавацца большае значэнне".

У «Піўзавода Аліварыя» новы гендырэктар

З 1 лістапада гэтую пасаду зойме Дзяніс Шарсценнікаў. Ён змяніў Міхаіла Чэчанева, які кіраваў кампаніяй на працягу шасці гадоў.

Цяпер 39-гадовы Шарсценнікаў займае пасаду віцэ-прэзідэнта па маркетынгу кампаніі "Балтыка" і рэгіёна Усходняя Еўропа Carlsberg Group. *"Я з задавальненнем прыступаю да новай работы ў камандзе "Аліварыі",* — адзначае ён. — *Задачы перад намі стаяць вельмі амбіцыёзныя, і новае прызначэнне — вялікая адказнасць для мяне. Я з нецярпеннем чакаю сустрэчы з новымі калегамі і краінай. Я быў у Беларусі некалькі разоў, і ўражанні у мяне ад краіны і людзей самыя цёплыя і прыемныя".*

Шарсценнікаў скончыў Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт эканомікі і фінансаў. Мае ступень MBA па агульным менеджменце Стакгольмскай школы эканомікі. Жанаты, выхоўвае сына і дзвюх дачок.

ПАРАЛЕЛІ



У Беларусі хлеб стаў даражэй на 10 працэнтаў, некаторыя гатункі — на 14 працэнтаў. Афіцыйна паведамляецца, што звязана гэта з агульным павышэннем цэн на электраэнергію, бензін і гэтак далей і таму падобнае. Але цікава, што ў расійскім Смаленску беларускі хлеб каштуе меней, чым у самой Беларусі.

Так, адзін расійскі рубель зараз каштуе прыкладна 280 беларускіх. Вось цэны на наш хлеб, установленыя ў расійскіх рублях. За 33 рублі можна купіць "Нарачанскі". Гэта 9438 беларускіх рублёў у Смаленску *(гл. фота)*. А вось у нашых магазінах гэты хлеб каштуе больш за 14 тысяч рублёў.

Ці возьмем хлеб "Радзівіл". У Расіі ён каштуе 77,5 рубля, альбо 21.700 на нашы грошы. А вось у Беларусі кошт гэтага самага хлеба — 32.600 рублёў...

ОТ РЕДАКЦИИ

В 125 странах мира издают и читают книги нашей соотечественницы ***Светланы АЛЕКСИЕВИЧ****. Недавно известная писательница вернулась в Минск после презентаций своей новой книги "Время секонд хэнд", с триумфом прошедших в Париже, Рейкьявике и Берлине. И снова, после оглушительного успеха прежних книг, — престижнейшая Премия Мира, которую ей торжественно вручат на днях в Германии... Сердечно поздравляем Светлану Александровну с этим событием, желаем доброго здоровья и неиссякаемой творческой энергии!*

Сейчас эта книга по продажам в московских магазинах опережает издания самых популярных российских авторов. Поступила она и в некоторые магазины Минска.

Предлагаем вниманию читателей "Народной Воли" предисловие к книге Светланы Алексиевич "Время секонд хэнд" (с небольшими сокращениями) и фрагмент текста с воспоминаниями нашей землячки Марии Войтешонок.



Светлана АЛЕКСИЕВИЧ

Время секонд хэнд

Записки соучастника

Мы прощаемся с советским временем. С той нашей жизнью. Я пытаюсь честно выслушать всех участников социалистической драмы...

У коммунизма был безумный план — переделать "старого" человека, ветхого Адама. И это получилось... может быть, единственное, что получилось. За семьдесят с лишним лет в лаборатории марксизма-ленинизма вывели отдельный человеческий тип — "homo sovieticus". Одни считают, что это трагический персонаж, другие называют его "совком". Мне кажется, я знаю этого человека, он мне хорошо знаком, я рядом с ним, бок о бок прожила много лет. Он — это я. Это мои знакомые, друзья, родители. Несколько лет я ездила по всему бывшему Советскому Союзу, потому что homo sovieticus — это не только русские, но и белорусы, туркмены, украинцы, казахи... Теперь мы живем в разных государствах, говорим на разных языках, но нас ни с кем не перепутаешь. Узнаешь сразу! Все мы, люди из социализма, похожие и не похожие на остальных людей — у нас свой словарь, свои представления о добре и зле, о героях и мучениках. У нас особые отношения со смертью. Постоянно в рассказах, которые я записываю, режут ухо слова: "стрелять", "расстрелять", "ликвидировать", "пустить в расход" или такие советские варианты исчезновения, как: "арест", "десять лет без права переписки", "эмиграция". Сколько может стоить человеческая жизнь, если мы помним, что недавно погибали миллионы? Мы полны ненависти и предрассудков. Все оттуда, где был ГУЛАГ и страшная война. Коллективизация, раскулачивание, переселение народов...

Это был социализм, и это была просто наша жизнь. Тогда мы мало о ней говорили. А теперь, когда мир необратимо изменился, всем стала интересна та наша жизнь, неважно какой она была, это была наша жизнь. Пишу, разыскиваю по крупицам, по крохам историю "домашнего"... "внутреннего" социализма. То, как он жил в человеческой душе. Меня всегда привлекает вот это маленькое пространство — человек... один человек. На самом деле там все и происходит.

...В общем-то, мы военные люди. Или воевали, или готовились к войне. Никогда не жили иначе. Отсюда военная психология. И в мирной жизни все было по-военному. Стучал барабан, развевалось знамя... сердце выскакивало из груди... Человек не замечал своего рабства, он даже любил свое рабство. Я тоже помню: после школы мы собирались всем классом поехать на целину, презирали тех, кто отказывался, до слез жалели, что революция, гражданская война — все случилось без нас. Оглянешься: неужели это мы? Я? Я вспоминала вместе со своими героями. Кто-то из них сказал: "Только советский человек может понять советского человека". Мы были люди с одной коммунистической памятью. Соседи по памяти.

Отец вспоминал, что он лично в коммунизм поверил после полета Гагарина. Мы — первые! Мы все можем! Так они с мамой нас и воспитывали. Я была октябренком, носила значок с кудрявым мальчиком, пионеркой, комсомолкой. Разочарование пришло позже.

(Окончание на 6-й стр.)

ПО ПОВОДУ



Мария ЭЙСМОНТ

Сомнительный тариф

Одна из последних новостей, бурно обсуждаемых в интернете, — новый вариант оплаты проезда в общественном транспорте Минска, который в столице обещают ввести уже в 2014 году.

Транспортники хотят установить дифференцированную оплату в зависимости от расстояния, чтобы пассажиры платили не просто за одну поездку, а за количество остановок или километраж. При этом чиновники обещают, что новые условия проезда в автобусах, троллейбусах, трамваях и метро "приведут к снижению затрат пассажиров". Мол, все просчитано, изучен западный опыт и т.д. и т.п.

В то, что проезд станет дешевле, верится с трудом. Хотя бы потому, что систему оплаты и контроля проезда придется автоматизировать, наверняка не один миллион долларов уйдет только на покупку и установку валидаторов — устройств, которые будут считывать с карточек пассажиров необходимые на проезд суммы. На форумах в интернете полно комментариев типа *"целая армия решает, как выманить у населения денежку", "будет все через одно место... чувствую... у нас по-другому не бывает".*

В возмущении нет ничего удивительного. За последние 18 лет мы привыкли, что все нововведения в нашем социально ориентированном государстве каким-то загадочным образом направлены не на улучшение жизни людей, а наоборот — чтобы побольше у простых людей отобрать или недодать им. Взять хотя бы несколько последних решений. Например, систему оплаты больничных листов так усовершенствовали, что выплаты по бюллетеням стали значительно ниже. Или бесконечные пересмотры списка льготников на приобретение лекарств. Его так откорректировали и ужали, что одно время даже малышам до трех лет родители были вынуждены покупать таблетки и микстуры за полную стоимость. В прошлом году, правда, льготу на бесплатные лекарства для таких деток вернули, но только из перечня основных препаратов, утвержденных Минздравом. А это в основном лекарства белорусского производства. Так и сегодня: если хочешь лечить кашель у ребенка импортным сиропом — плати по полной.

Примеров такой "заботы" государства о своих гражданах можно привести еще как минимум с десяток, есть они в любой области — медицине, образовании, строительстве жилья, на транспорте. Так почему мы должны верить, что с изменением системы оплаты проезда тратить на городской транспорт мы не станем больше? Тем более что каждое повышение проезда в автобусах, троллейбусах, метро происходит под неустанные комментарии транспортников: пассажиры оплачивают 30% от полной стоимости проезда. Последнее повышение, например, сопровождалось словами министра транспорта и коммуникаций Анатолия Сивака, который заявил, что талончик в столице должен стоить не менее 6 тысяч рублей.

Наши чиновники любят повторять, что цена проезда в общественном транспорте Беларуси одна из самых низких в мире, что в Европе она в разы выше. Но в Европе и зарплаты другие. И, что самое главное, максимальные тарифы на проезд существуют не для всех. В некоторых странах студенты, школьники и пенсионеры вообще за проезд не платят, в других — имеют большие скидки. Недавно подруга вернулась из Германии и рассказывала, как они с дочерью — студенткой Кёльнского университета вдвоем пользовались проездным билетом дочери.

В Германии, где высшее образование бесплатное, студенты покупают за 500 евро так называемый годовой студенческий билет плюс проездной на все виды транспорта (куда входит не только городское сообщение). И потом в течение года в пределах своей земли могут бесплатно посещать театры, бассейн, спортзал, библиотеку, пользоваться интернетом и общественным транспортом. И, что самое удивительное, в определенные утренние и вечерние часы, выходные дни и во время каникул студенты имеют право по своему проездному билету брать с собой в транспорт одного человека. Так как моя приятельница навещала дочь именно в каникулярное время, то они вдвоем пользовались одним проездным при поездках по Кёльну, его окрестностям и даже по всей земле Северный Рейн-Вестфалия. Только один раз ей пришлось купить билет за полную стоимость, когда из Дортмундского аэропорта она добиралась до Кёльна. "Билет стоил около 22 евро, — рассказывала подруга. — Но и условия проезда соответствовали цене. Во-первых, расстояние, во-вторых, комфортная скоростная электричка, бесшумная, с мягкими креслами, благоухающими туалетами, где есть не только туалетная бумага, но и одноразовые полотенца, влажные салфетки. Ни в какое сравнение с нашими поездами, даже международного класса, например, Вильнюс—Минск, не идет".

Но, собственно, почему мы должны проводить сравнение со странами, уровень жизни и доходы населения которых значительно выше, чем в Беларуси. Давайте глянем, сколько платят за проезд в тех странах, где зарплаты и пенсии приблизительно такие же, как у нас.

Например, в Украине талончик на одну поездку в трамвае, троллейбусе и автобусе стоит полторы гривны, это меньше, чем 1700 белорусских рублей. Жетон в метро несколько дороже, но все равно по стоимости услуг киевское метро дешевле минского. В киевской подземке за одну поездку заплатишь в пересчете на наши деньги 2 тысячи 250 рублей, у нас — две с половиной тысячи. Но в Украине пенсионеры, студенты и дети общественным транспортом пользуются бесплатно. Ребятня до 7 лет даже за проезд в маршрутном такси ничего не платит.

В сентябре я отдыхала в Грузии. Власти этой страны не определяют свое государство как социально ориентированное. Но в пересчете на наши деньги проезд в общественном транспорте там стоит 2 тысячи 250 рублей. Средняя зарплата в Грузии сегодня почти такая же, как в Беларуси, — 500 долларов. Пенсии ниже, около 130 долларов, но там и на общественный транспорт для пенсионеров существуют скидки — 50%, а для некоторых категорий проезд бесплатный. И если кто-то думает, что автопарк в Тбилиси не чета минскому, — ошибается. Как минимум по комфорту он ничем не уступает, многие автобусы и все маршрутные такси оснащены кондиционерами. А остановки общественного транспорта уже давно оборудованы электронными табло с расписанием автобусных маршрутов. И не только в столице, но в других городах Грузии.

В Беларуси льготы на городской транспорт остались только у тех, кто в силу возраста и болезней им практически не пользуется, — ветеранов войны, инвалидов I и II групп. Даже школьники бесплатно могут ездить в городских автобусах, троллейбусах, трамваях и метро только во время учебного года и только по маршруту "дом—школа—дом". Поэтому, если разобраться, хвастаться нам нечем. А если вспомнить, что цена на бензин в Беларуси значительно ниже, чем не только в Европе, но и в Украине и Грузии, то говорить о белорусском общественном транспорте как о самом дешевом в мире — по крайней мере — просто стыдно.

ПАСЛЯ ТРАГЕДЫ

Смерць у ізалятары

Маці памерлага ў Салігорскім ізалятары часовага ўтрымання Аляксандра Акуліча ўжо год шукае праўду аб смерці сына.



Апошнім часам ва ўсіх на слыху так званая *“справа **Ігара Пцічкіна**”*. Мінчанін памёр у следчым ізалятары на вуліцы Валадарскага 4 жніўня гэтага года. Смерць наступіла пасля таго, як ён правёў у СІЗА 4 дні. Упраўленнем Следчага камітэта па Мінску ўжо распачата справа *“па факце неналежнага выканання прафесійных абавязкаў работнікам медчасці СІЗА №1, якое па неасцярожнасці прывяло да смерці асуджанага Пцічкіна”.*

Справа **Аляксандра Акуліча** не такая рэзанансная. Ды і прайшоў ужо год. Але сёння яго маці Валянціне Аляксееўне ад гэтага не лягчэй. Яна піша скаргі ў розныя інстанцыі, шукае праўду, звяртаецца да праваабаронцаў... Што ж адбылося год таму?

Аляксандр Акуліч любіў выпіць. Пасля таго, як ён пайшоў у чарговы загул, маці вырашыла: трэба ратаваць сына. Хоць нейкім чынам на час ізаляваць ад зялёнага змея. Параілася з участковым, той распавёў, што можна пасля адпаведнага звароту змясціць Аляксандра ў ізалятар часовага ўтрымання. Жанчына так і зрабіла: патэлефанавала ў міліцыю, сыну далі 5 сутак адміністрацыйнага арышту. А праз чатыры дні Аляксандра Акуліча не стала...

“На чацвёртыя суткі знаходжання ў ізалятары сыну зрабілася дрэнна, — распавяла Валянціна Аляксееўна. — *Адразу ж “хуткую” не выклікалі, хоць сукамернікі прасілі аб гэтым. Саша пачаў бегаць па камеры. Яго вывелі, за кайданкі прычапілі да кратаў, збілі. Дарэчы, відэакамера назірання зафіксавала ўсё толькі да моманту, калі сына вывелі з камеры “сутачнікаў”. “Хуткая” прыехала, калі сын быў ужо нежывы. Пра яго смерць паведамілі мне толькі раніцай. Прыехала ў морг, цела адмовіліся паказаць. Убачыла яго, толькі калі прывезлі дадому. Увесь у сініяках, рукі, ногі і твар чорныя... Патэлефанавала ў міліцыю, кажу: “Вы забілі майго сына”. Прыехалі два міліцыянеры. Прасіла зафіксаваць пабоі на целе на камеру — адмовіліся. У той жа вечар я напісала заяву, у якой папрасіла правесці праверку па факце смерці і з* нагоды наяўнасці на яго целе шматлікіх цялесных пашкоджанняў”.

У матэрыялах праверкі пазначаны дадзеныя судова-медыцынскай экспертызы. Цялесныя пашкоджанні знайшлі, але яны *“належаць да лёгкіх і не знаходзяцца ў прычынна-следчай сувязі з надыходам смерці”.*

Ва ўзбуджэнні крымінальнай справы было адмоўлена. У пастанове следчы **В.У.Петачэнка** паведаміў Валянціне Аляксееўне: маўляў, фізічная сіла і спецсродкі ў дачыненні да яе сына прымяняліся, аднак толькі таму, што той *“паводзіў сябе агрэсіўна, не падпарадкоўваўся супрацоўнікам міліцыі, іх законным патрабаванням”.* Дзеянні супрацоўнікаў міліцыі **А.Г.Сцешанкова і А.А.Бачко** былі *“ў межах прадастаўленых ім паўнамоцтваў”,* а таму падстаў для ўзбуджэння крымінальнай справы няма.

Маці вырашыла ісці да канца. Палічыўшы, што праверка па факце смерці яе сына праведзена недастаткова поўна, звярнулася са скаргай да пракурора Светлагорскага раёна. У скарзе яна настойвала на правядзенні дадатковай судова-медыцынскай экспертызы і прыняцці па яе выніках рашэння аб прыцягненні вінаватых асоб да адказнасці.

Навошта білі хворага чалавека? Ці своечасова была аказана медыцынская дапамога? Якую дапамогу наогул аказалі? Ці была смерць Аляксандра Акуліча непазбежнай пры своечасова аказанай медыцынскай дапамозе?.. Вось што хвалявала Валянціну Аляксееўну ў першую чаргу.

Спецыялісты Упраўлення складаных судова-медыцынскіх экспертыз Дзяржкамітэта судовых экспертыз адказалі так: *“Якой-небудзь медыцынскай дапамогі Акулічу А.А. не аказвалася ў сувязі з тым, што па прыездзе ўжо была канстатавана яго біялагічная смерць... Судова-медыцынская экспертная камісія не займаецца якімі-небудзь прагнозамі, а ацэньвае толькі аб’ектыўна ўстаноўленыя факты, у сувязі з гэтым адказаць на пытанні не ўяўляецца магчымым”.*

Адным словам: куды ні кінь — усюды клін. Але Валянціна Акуліч падрыхтавала чарговае хадайніцтва пракурору, у якім настойвае на допыце экспертаў. Ці маглі выратаваць сына? Валянціна Аляксееўна ўсё ж спадзяецца, што ёй дадуць канкрэтны адказ на канкрэтнае пытанне.

— Ёсць, натуральна, праблема з тым, што людзей са слабым здароўем адпраўляюць за краты, а затым недастаткова ўвагі надаюць таму, каб быў паўнацэнны медыцынскі дагляд, — кажа адвакат **Павел САПЕЛКА**. — Гэта нізкая і медыцынская, і прававая, і проста чалавечая культура. У выпадку з Акулічам супрацоўнікі міліцыі адкрытым тэкстам казалі падчас правядзення праверкі, што яны бачылі — чалавек не ў сабе. Але не знайшлі нічога лепшага, як збіць яго. Маўляў, кідаўся на міліцыянераў. Людзі ў форме не ўбачылі розніцы паміж паводзінамі хулігана і хворага чалавека. Відавочна, што Аляксандр Акуліч не кантраляваў сябе. У народзе гэтую хваробу называюць “белая гарачка”. Чалавеку тэрмінова патрабавалася медыцынская дапамога. Падчас расследавання гэтай справы ў асноўным звярталася ўвага на тое, ці памёр чалавек ад удараў, якія нанеслі міліцыянеры. Аднак жа пытанне зусім у іншым. Чаму своечасова не аказалі меддапамогу? Эксперты з гэтай нагоды далі вельмі незразумелае тлумачэнне. Маўляў, яны не могуць сказаць, ці дапамаглі б чалавеку медыкі, бо на момант прыбыцця фельчара Акуліч быў ужо мёртвы. Адным словам, чалавека няма, а праблема засталася.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

КАМЕНТАРЫЙ ПА СПРАВЕ

Валянцін СТЭФАНОВІЧ, праваабаронца:

— Справы Ігара Пцічкіна, Аляксандра Акуліча... Шчыра кажучы, у нас няма поўнай статыстыкі, колькі такіх выпадкаў, калі людзі паміраюць у ізалятарах. Праблема носіць досыць утоены характар, бо не ўсе блізкія памерлых публічна расказваюць пра гэта. Да таго ж уся сістэма, якая ўваходзіць у Дэпартамент выканання пакаранняў МУС Беларусі, вельмі закрытая для грамадскага кантролю. Таму што ніякія праваабарончыя арганізацыі не могуць бесперашкодна наведваць гэтыя ўстановы. На нацыянальным узроўні ў нас няма спецыяльных механізмаў па абароне правоў чалавека. У той жа Украіне амбудсмен у суправаджэнні двух прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый можа ў любы час свабодна заходзіць у месцы прымусовага ўтрымання грамадзян дзеля праверкі нейкіх фактаў, якія да яго дайшлі. Вось гэта і ёсць адзін з механізмаў кантролю.

Таму сёння вельмі складана высветліць, што на самай справе паслужыла прычынай гібелі чалавека. Паўтаруся, сістэма закрытая, і яна не зацікаўлена выносіць, як кажуць, смецце з хаты. Тая ж маці Аляксандра Акуліча ўжо год змагаецца з гэтай сістэмай, каб высветліць праўду пра сына. Інстытуту выканання пакаранняў ужо даўно неабходна рэформа...

ПАЛІТКУХНЯ

Андрэй Саннікаў — Зміцер Бародка: шляхі разышліся

У панядзелак былы кандыдат у прэзідэнты, кіраўнік кампаніі “Еўрапейская Беларусь” Андрэй Саннікаў распаўсюдзіў кароткую заяву, у якой адмежаваўся ад аднаго са сваіх самых даўніх паплечнікаў.

“Па даручэнні каардынатараў грамадзянскай кампаніі “Еўрапейская Беларусь” заяўляю, што Зміцер Бародка ў сувязі са стратай даверу больш не з’яўляецца каардынатарам “Еўрапейскай Беларусі” і не прадстаўляе нашу грамадзянскую кампанію”.

Андрэй Саннікаў зараз жыве ў Лондане, Зміцер Бародка — у Варшаве. Што ж не падзялілі былыя паплечнікі там, у замежжы?

Вось якія тлумачэнні даў Зміцер Бародка:

— З прыкрасцю даведаўся аб заяве Андрэя Саннікава аб маім выключэнні з гэтай арганізацыі. Мне шкада, што нам, беларусам, зноў не ўдалося дамовіцца паміж сабой і я вымушаны сёння даваць тлумачэнні па гэтай сітуацыі.

Змушаны з’ехаць адразу пасля выбараў 2010-га, я пачаў рабіць у Варшаве тое, што можна было рабіць для Беларусі, для палітвязняў, для іх сем’яў — звонку краіны. Менавіта дзеля гэтага я намагаўся зарэгістраваць тут, у Варшаве, фундацыю “Еўрапейская Беларусь”. У яе Радзе такія знаныя асобы, як Станіслаў Шушкевіч і дэпутат Сэйма Адам Ліпіньскі, у яе ўваходзіў Віктар Івашкевіч, які, на жаль, днямі пайшоў з жыцця. Таксама сумесна з “Рухам за Свабоду” нам удалося арганізаваць Беларускі дом у Варшаве. Цягам двух гадоў ён стаў вядомай пляцоўкай, якая яднае беларусаў Польшчы і тых, каму цікавыя Беларусь і беларусы.

Ідэя арганізаваць у Варшаве нядзельную беларускую школку вырасла ў Клуб беларуска-польскіх сямей Rodzinka. Мы правялі дзясяткі розных — культурных, літаратурных, навуковых, дыскусійных — імпрэз. Мы ладзілі нядзельную школку для маленькіх беларусаў і Дні беларускай кухні для дарослых, святкавалі Дзень Волі і збіраліся сем’ямі на ёлку, вучыліся аўтэнтычным традыцыям Калядаў ды Купалля і нават разам выязджалі на турыстычныя злёты.

Так стварылася кампанія “Разам для Беларусі”, мэтай і задачамі якой з’яўляецца работа па аб’яднанні беларускіх дыяспар па ўсёй Еўропе. Я думаю, гэта тая справа, якую я магу і мушу рабіць у сённяшніх умовах, тут і зараз. І гэтая праца вымагае вялікіх высілкаў і шмат часу.

На жаль, кіраўніцтва “Еўрапейскай Беларусі” не зацікавіў гэткі кірунак нашай дзейнасці. Мяне папрасілі перадаць ім фундацыю “Еўрапейская Беларусь” і маю заснавальніцкую частку ў Беларускім доме ў Варшаве. З першым я абсалютна згодны, бо не з’яўляюся аўтарам брэнду “Еўрапейская Беларусь”. А вось Беларускі дом у Варшаве даўно выйшаў за межы нейкай звычайнай юрыдычнай адзінкі і не можа належаць вузкаму палітычнаму колу. Гэта — пляцоўка. Пляцоўка для рэалізацыі жыццяздольных ідэй усіх беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый і актыўных беларусаў. Менавіта гэткі прынцып быў закладзены пры стварэнні Беларускага дома як ягоная місія.

Але я ўсё адно ўдзячны за тыя 12 гадоў досведу, якія дала мне праца ў “Еўрапейскай Беларусі”, а асабліва за цяжкі, але бясцэнны вопыт апошняй выбарчай кампаніі.

Я са шкадаваннем заяўляю, што спыняю сваю працу рэгіянальным каардынатарам “Еўрапейскай Беларусі”. Але працягваю працаваць дзеля будучыні дэмакратычнай еўрапейскай Беларусі як садырэктар Беларускага дома ў Варшаве і кіраўнік кампаніі “Разам для Беларусі”.

Ігар МАРОЗАЎ.

ШЧЫРА

Ірына ВЕШТАРД: «Не хапае часу на тое, каб пыл з мэблі сцерці!»

Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Ірына Вештард распавяла, што партыйцы скідваюцца ёй на новы планшэт.

Некаторымі падрабязнасцямі свайго асабістага жыцця Ірына Зянонаўна падзялілася з партыйным сайтам bsdp.org.



— У мяне ўжо аднойчы спыталіся, калі я прыехала на важную сустрэчу, дзе я прыпаркавалася і ці не будзе маё аўто замінаць іншым машынам, — *гаворыць Вештард*. — Сказала, што цягнік метро і аўтобус з машыністам і вадзіцелем адпусціла.

Працуючы на дзяржаўнай рабоце, я так і не разбагацела, каб набыць сабе аўтамабіль. Некаторыя злыя языкі паклёпнічаюць, што ў маёй кватэры еўрарамонт, што я зрабіла такі ж самы еўрарамонт у сваёй сястры і што ў мяне грошай куры не дзяўбуць.

Хачу расчараваць — жыву я даволі сціпла, па-сацыялістычнаму. Вось у мяне сапраўды лад жыцця не разыходзіцца з каштоўнасцямі, дзе грошы і заможнасць не з’яўляюцца першаасновай. Я ў гэтым пытанні як Папа Рымскі Францішак, які, перад тым як стаць Папам, будучы ўжо на дастаткова высокай царкоўнай пасадзе, ездзіў у звычайным метро.

Хачу сказаць, што такая язда дае свае плюсы — ведаеш, пра што людзі размаўляюць і як яны рэагуюць на падзеі, што адбываюцца ў нашай краіне.

Карацей, пафанабэрыцца аўто, катэджам ці еўрарамонтам у кватэры не магу. У гэтым плане я самы звычайны чалавек. У мяне, бывае, не хапае часу на тое, каб пыл з мэблі сцерці, бо партыйная работа займае ўвесь мой вольны час, не кажучы пра тое, каб зрабіць рамонт.

Кінуць кліч сярод партыйцаў, як гэта зрабіў Гайдукевіч-малодшы, каб людзі скінуліся і набылі мне аўто, я не магу — у нас у партыі няма такой колькасці бізнесменаў і дзяржаўных службоўцаў, хто валодае празмернымі грашовымі рэсурсамі. Адно скажу — партыйцы абяцалі скінуцца і набыць мне планшэт, каб была дасяжная ў сетцы, калі я ў дарозе...

ДИСКУССИЯ

Референдум в условиях диктатуры — это дубина в руках диктатора против народа

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Лишая, через “ручные парламенты” и их “законы” — гражданское общество и политических оппонентов всякого контроля за процессом “выборов”, диктаторские режимы **всегда и гарантированно** обеспечивают себе необходимый результат. Любые стратегии и тактики оппонентов бессмысленны, поскольку результат “выборов” определяется до назначения даты “выборов”. К тому же ни одна диктатура не позволит существовать какой-либо политической силе в стране, способной претендовать на власть. Остается лишь “оппозиция”, не представляющая угрозы для власти, но необходимая ей для обеспечения внешней видимости “демократической процедуры выборов”.

Сменить диктаторский режим на демократический мирным путем возможно только через создание равных условий конкурентной борьбы оппонентам при прозрачности, открытости и честности всего политического процесса при полном контроле на всех этапах выборов. Чем стаж диктаторского режима больше, тем меньше шансов на создание таких условий. Груз ответственности закоренелых диктатур настолько велик, что терять власть и отвечать за свои деяния нет никакого смысла, поэтому и держатся они до последнего, пока не происходят всевозможные революции. И ответственны за силовые варианты свержения как раз диктаторские режимы, а не разгневанный народ, желающий перемен и лишенный права избирать.

При демократии борьба идет между политическими оппонентами, предлагающими свой путь развития страны и общества. Народ выбирает путь и политическую силу, готовую воплотить свои обещания в жизнь. Получает мандат на управление от народа.

При диктатуре нет борьбы между оппонентами, нет вариантов пути развития и нет права народа выбирать. При диктатуре линия фронта проходит между диктатором, узурпировавшим власть незаконным путем, и гражданами страны, сражающимися за восстановление своего конституционного права избирать и быть избранными.

Вопрос об участии в выборах политических сил по законам диктатуры является для этих сил тестовым. Если политические оппоненты ставят перед собой задачу прихода к власти и проведения назревших реформ, то они обязательно выдвигают условие создания необходимых и равных возможностей для конкурентной борьбы. Право выбора принадлежит народу, а это и есть демократия.

Если политические оппоненты без каких-либо условий заявляют о своем участии в “выборах” по законам диктатуры, то очевидно, что никаких задач и целей прихода к власти у них нет и функция их сводится лишь к обеспечению внешней видимости “демократичности процесса”. На юридическом языке это называется “пособничество”.

Проблема несоответствия сути и формы “выборов” при диктатуре является одной из главных для диктатур.

Вторая серьезная проблема для “выборов” при диктатуре возникает, когда обман избирателей становится очевидным и граждане, не желающие быть обманутыми, перестают принимать участие в этом шоу режима. Возникает ситуация бойкота “выборов”.

Если понятия “выборы” и “референдум” относятся к категории демократических процедур и бессмысленны при диктатурах, то понятие “бойкот” бессмысленно при демократической процедуре выборов, но юридически и политически обосновано для протестной части избирателей при диктатуре.

Диктаторский режим лишает граждан права избирать и быть избранными, а оппонентов власти малейшего шанса на победу. В этой ситуации (осознанно или нет, это неважно) народ, не приходя на избирательные участки, лишает властных полномочий диктатора. Захват власти через обман не состоялся, фальсифицировать нечего. Диктатор лишается права отдавать приказы, издавать указы, требовать от граждан выполнения обязательств. Власть перестает быть властью. **Бойкот не дает победы никому. Но бойкот лишает диктатуру власти**, и все политические силы уравнивает в своих правах.

Диктаторы, как правило, не отказывают себе в удовольствии удержать власть вооруженным путем, но статус у них уже совершенно другой. Это уже незаконное вооруженное бандформирование. Желающих поучаствовать в таком бандформировании резко сокращается, а уголовная ответственность резко возрастает.

Второй путь выхода из нулевого варианта — восстановление конституционных прав граждан избирать и быть избранными и создание для этого необходимых условий. То есть проведение демократических выборов.

Бойкот выборов при диктатуре, как ни странно, не зависит от политических оппонентов режима. Бойкот — это степень осознания гражданами обмана и манипуляций со стороны режима при проведении “выборов”. И чем больше осознание, тем меньше желающих быть обманутыми и участвовать в этих шоу режима. Этим можно объяснить, почему избиратели не прислушивались к призывам авторитетных политиков бойкотировать “выборы” на ранних стадиях диктатуры в Беларуси. Обман делал свое дело, и большинство не осознавало этого. После 2010 года бессмысленны стали призывы “придворной оппозиции” к избирателям активнее участвовать в выборах, “вставать с диванов” и т.д. Большинство уже осознало обман режима и научилось распознавать “бойцов невидимого фронта” (нет борьбы, нет фронта, спектакль — и не более того, а “бойцы”, правда, есть) и не реагировать на их призывы.

Как бы кому ни хотелось, но число сторонников бойкота среди избирателей будет расти от одной политической кампании к следующей. Потому что бойкот подчиняется объективным законам, а не субъективным желаниям.

Вопрос бойкота — это тест не для избирателей, а тест для политиков. Вы с кем — с народом или с режимом? Режим боится бойкота. Именно режим через административные рычаги, через свои “законы” пытается остановить этот протест, это гражданское неповиновение народа. И даже ввести какую-то административную ответственность за бойкотирование или срыв политической кампании под названием “выборы”.

Все это абсурдно политически и глупо юридически. С юридической точки зрения срыв выборов означает необеспечение равных и широких условий кандидатам для открытой и честной борьбы. Невоспрепятствование давлению на избирателей по принуждению их к участию или неучастию в голосовании. Ненадлежащий контроль над процедурой голосования, над составлением протоколов и оглашением результатов голосования, способствующими подтасовкам и фальсификациям волеизъявления народа.

Если говорить о выборах без кавычек, выборах, которые соответствуют понятию “выбор”, то всю ответственность за срыв выборов необходимо возложить на орган, ответственный за организацию выборов, т.е. на ЦИК и ее руководителя.

Если говорить о выборах в кавычках, то есть когда нет выбора, то возникает ситуация юридической бессмысленности. Как можно сорвать то, чего нет? С юридической точки зрения отсутствует объект посягательства, соответственно, нет состава правонарушения или преступления. О какой ответственности тогда может идти речь? (Хороший, кстати, тест для “избранников” Палаты №5.)

Все вышеизложенное относится в основном к теории и законам существования разных форм общественного управления — диктаторского и демократического. Как научили, так и изложил.

Теория для того и существует, чтобы помогать искать выходы из кризиса и приближаться к объективным законам развития общественно-политических и социально-экономических отношений.

Нижеизложенное личное мнение автора не является истиной в последней инстанции, но тем не менее позволю его высказать.

Как бы ни развивались события в Беларуси, альтернативы проведения честных, открытых, прозрачных и демократичных выборов нет. А их можно провести только после принятия изменений в избирательное законодательство, расширяющих возможности кандидатов для агитационных мероприятий, уравнивающих их в правах и возможностях и предельно усиливающих контроль всех заинтересованных сторон за избирательной кампанией. Это единственный нормальный, конституционный и мирный путь перехода от диктатуры к демократии.

Каждый, кто препятствует проведению демократических выборов в Беларуси, используя свой служебный или политический статус, должен понимать и свою ответственность за негативные последствия доведения народа до необходимости восстановления своих попранных прав иным, не мирным, путем. При этом не следует забывать, что народ — первоисточник власти. И действия народа в подобной ситуации будут квалифицироваться как действия в состоянии необходимой обороны (или в состоянии крайней необходимости). Причем это не обязательно имеет отношение к должностным лицам от власти, это в равной степени относится и к отдельным членам “оппозиции”, подрабатывающим на полставки пособниками режима. Не надо забывать, что ответственность организатора, подстрекателя и пособника наступает по той же статье, что и исполнителя.

Об этом необходимо говорить сейчас, пока эти негативные последствия не наступили. Проведение демократических выборов нужно начинать не с 2015 года, а именно сейчас, с выборов в местные Советы. Именно демократические выборы в местные Советы откроют для Беларуси новые политические имена, новых лидеров и среди реальной оппозиции. Нынешние лидеры “оппозиции” имеют те же диктаторские “болезни” “вечных” лидеров. В качестве доказательства можно вспомнить выборы в Верховный Совет 12-го созыва. Даже относительно демократические выборы начала 1990-х годов выявили много новых политиков, пускай разных. Но это были действительно политики. И оппозиция была не кукольная, а настоящая.

Кто может вспомнить хоть одного яркого политика при выборах по законам диктатуры во все пять палат представителей власти?

Поэтому при диктатуре и нет ответа на вопрос: “Кто вместо А.Лукашенко?” В крайнем случае могут ответить: “Сын!” При демократии таких вопросов нет. Потому что при демократии обществом управляет Его Величество ЗАКОН. И все исполняют его требования и отвечают перед ним. Лидеры приходят и уходят, а Закон правит беспристрастно и справедливо для всех и каждого.

Вечных диктатур не бывает. Это очень затратная для общества форма правления. Это несправедливая и жестокая форма правления. И наша диктатура не исключение.

Очевиден системный кризис, причем во всем. В промышленности, внутренних и внешнеполитических отношениях, в финансах, образовании и медицине, сельском хозяйстве. Во всем. Причем негативные тенденции усиливаются. Перспективу никто не может предсказать даже на несколько месяцев вперед. Исчерпаны важнейшие ресурсы диктатуры — материально-финансовый, а главное — ресурс доверия народа к власти. И нет факторов, которые могли бы переломить ситуацию с негатива на позитив.

Для реальной оппозиции, для всех сторонников перемен (причем хороший шанс для мирного пути) благоприятное время предъявить власти ультиматум и реально объединиться под лозунгом “Демократические выборы или бойкот лжевыборам!”, тем более что большинство избирателей с бойкотом определилось. Выбор за политиками. Для власти это болезненный выбор, но не смертельный. Переговоры и компромисс всегда лучше войны и крови. А “народный референдум”, задуманный группой “товарищей”, нужно отложить до демократических времен, дабы не усложнять и без того белорусскому народу непростую жизнь.

Смолевичский район.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Скандал у партыі Гайдукевіча

Следчы камітэт пачаў крымінальную справу ў дачыненні да дарадцы па бяспецы старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. Ён падазраецца ў распаўсюджванні дзіцячай парнаграфіі з выявай сваёй малалетняй дачкі.

Ад “героя” ў партыі паспяшаліся адхрысціцца. Намеснік старшыні партыі Алег Гайдукевіч сцвярджае, што “саветнік па бяспецы” — гэта звычайны ахоўнік.

— Ніякай бяспекай ён не займаўся, ён быў звычайным ахоўнікам у адной нашай структуры. Калі партыя нейкія мерапрыемствы праводзіла, ён быў задзейнічаны як ахоўнік. Ён быў выключаны з партыі за п’янства. Быў выключаны яшчэ тры месяцы таму, задоўга да гэтых падзей, — распавёў Алег Гайдукевіч.

Па словах намесніка старшыні ЛДП, да ўчынку цяпер былога аднапартыйца ён ставіцца вельмі негатыўна і лічыць, што той заслугоўвае самага жорсткага пакарання. “Калі гэта праўда, то ён вырадак, і таму самыя жорсткія меры ў дачыненні да яго павінны быць прынятыя, — гаворыць Алег Гайдукевіч. — Абараняць яго ніхто ніколі не будзе... Яму павінна быць самае жорсткае пакаранне. Мая пазіцыя — аж да расстрэлу. Расстрэл або пажыццёвае. Гэта ж дзеці — святое...”

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

«Справа Гутара» працягваецца...

28 кастрычніка Вышэйшы спартыўны суд у Лазане разгледзіць справу варатара мінскага “Дынама” і зборнай Беларусі Аляксандра Гутара.

Нагадаем, у студзені 2013 года былы галкіпер барысаўскага БАТЭ Аляксандр Гутар скасаваў кантракт з клубам і перайшоў у мінскае “Дынама”. Барысаўская каманда выказала нязгоду з гэтым.

Лепшы футбаліст Беларусі 2011 года Гутар звярнуўся ў БФФ у сувязі з тым, што ў сезоне-2012 гуляў за клуб менш чым у 10% матчаў. 22 студзеня камітэт асацыяцыі “Беларуская федэрацыя футбола” дазволіў Гутару пакінуць БАТЭ з выплатай кампенсацыі ў 180 тысяч долараў. БАТЭ не задаволіла такое рашэнне, і клуб вырашыў шукаць справядлівасць у Вышэйшым спартыўным судзе.

“Ведаеце, я асабліва гэтай справай не займаюся, — сказаў **Аляксандр Гутар** goals.by. — *Мая справа — трэніравацца, гуляць у футбол. А справай займаюцца адвакаты. Паставяць у вядомасць, калі спатрэбіцца. А так я гэтым нават не цікаўлюся. Не хачу забіваць галаву, мне гэта не трэба. Мне трэба паказваць добрую гульню і радаваць балельшчыкаў”.*

Аляксандр НІКАНОРАЎ.

РЭЗАНАНС

А як жа нейтралітэт?



У "Народнай Волі" №75 ад 24 верасня 2013 года былі надрукаваны тэзісы "круглага стала", у якім удзельнічалі ваенны аглядальнік Аляксандр Алесін, аналітык праекта Belarus Seckzity Blog Андрэй Паротнікаў, палітолаг Юрый Чавусаў, палітолаг Дзяніс Мельянцоў і іншыя. Тэма — "Расійская авіябаза: чаму беларусам трэба непакоіцца?".

Чытаеш матэрыялы таго "круглага стала" і бачыш, што сама па сабе тэма быццам бы і слушная, але ў сваёй аснове яна неканкрэтная і неабгрунтаваная, а так, аб усім і ні аб чым. Быццам бы гаворка ідзе не пра лёс краіны і яе народа, а пра хакейны матч... А на мой погляд, пытанне аб размяшчэнні расійскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі патрэбна ставіць у зусім іншым ракурсе, гэта ж пытанне жыцця і смерці беларускага народа! Гэта значыць — на падмурку тых афіцыйных дакументаў, якія былі падпісаны кіраўнікамі трох краін (ЗША, Вялікабрытаніі і Расіі). Там гарантавалася для Беларусі незалежнасць, бяз'ядзернасць і нейтральнасць, што гарантуе і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Беларусь — незалежная краіна, і ніхто не мае права парушаць яе межы, выкарыстоўваць яе багацці, разбураць культуру, нацыянальную ідэю, рэлігію і г.д. Бадай, самае галоўнае — гэта нейтральнасць Беларусі, што азначае абсалютную бяспеку з боку любой іншай краіны і неўваход самой у іншыя вайсковыя блокі.

Але на самай справе Расія парушыла дамоўленасць, бо знаходжанне расійскіх войскаў на нашай тэрыторыі — гэта, на мой погляд, адкрытая яе каланізацыя. А як жа дамоўленасці аб нейтралітэце?..

